## ВОБРАЗ «НОВАЙ» ЖАНЧЫНЫ КІТАЯ Ў АПОВЕСЦІ ЧЖАН АЙЛІН «СЛЯДЫ КАХАННЯ»

*Д.А.Тракала (Мінск, МДЛУ)*

У артыкуле разглядаюцца адметнасці вобраза «новай» жанчыны Кітая ў перыяд вайны супраціўлення Японіі (1937-1945 гг.) на аснове твора Чжан Айлін «Сляды кахання». Аналізуюцца асаблівасці вобраза «новай» жанчыны, абумоўленага культурным і сацыяльна эканамічным становішчам Кітая, а таксама цеснай сувяззю з біяграфіяй пісьменніцы, што дазваляе адлюстраваць рэальныя і актуальныя праблемы, якія закранаюць грамадства Кітая таго часу.

**Ключавыя словы**: *кітайская літаратура; Чжан Айлін; вобраз «новай» жанчыны Кітая; аповесць.*

## THE IMAGE OF THE «NEW» WOMAN OF CHINA IN ZHANG AILING'S STORY «TRACES OF LOVE»

*D. O. Trekalo (Minsk, MSLU)*

The article examines the distinctive features of the image of a «new» woman of China during the War of resistance against Japan (1937-1945) based on Zhang Ailing's work «Traces of love». The features of the image of the «new» woman are analyzed, determined by the cultural and socio-economic situation of China, as well as the close connection with the biography of the writer, which allows us to reflect the real and urgent problems affecting  society of China at that time.

**Key words:** *Chinese literature; Zhang Ailing; the image of the «new» woman of China; story.*

Чжан Айлін (张爱玲) (20 верасня 1920 – 8 верасня 1995) – пісьменніца, перакладчык, даследчык кітайскай літаратуры, належыць да найбольш яскравых прадстаўнікоў шанхайскага літаратурнага алімпу 1940-х гг. і эміgranцкай кітайскай літаратуры. Першую папулярнасць у асяроддзі шанхайскіх інтэлектуалаў ёй прынеслі аповесці «Каханне, якое разбурае гарады» (1943 г.) і «Запіскі пра залаты замак» (1943 г.), а апублікаваны зборнік «Навелы» (1944 г.), толькі замацаваў яе статус літаратурнага генія [1].

Творчасць Чжан Айлін адлюстроўвае сутнасць камуністычнага ладу КНР, актуальныя тагачасныя грамадскія праблемы, адной з якіх з'яўляецца саслоўнае і патрыярхальнае ўладкаванне традыцыйнага Кітая. Сярод важных асаблівасцей жаночых вобразаў Чжан Айлін вылучаецца іх цесная сувязь з біяграфіяй пісьменніцы. Многія рысы характару і бытавыя сітуацыі, у якіх аказваюцца гераіні, не з'яўляюцца плёнам аўтарскай выдумкі, а адлюстроўваюць жыццёвы вопыт самой пісьменніцы або яе бліжэйшага акружэння.

Да асаблівасцей адлюстравання вобразу «новай» жанчыны Кітая ў творчасці Чжан Айлін неаднаразова звярталіся такія рускамоўныя літаратуразнаўцы, як Ю.А.Купрыянава, А.В.Шатраўка, А.В.Кандраценка і інш. Іх навуковыя працы даюць магчымасць спасцігнуць адметнасці развіцця кітайскага традыцыйнага грамадства, у тым ліку ў кантэксце яго змяненняў і перапляцення з новымі павевамі культуры.

Як слушна адзначае даследчыца А.Ю. Анцыферава: «Пад вобразам новай жанчыны варта разумець моцную, гарманічную, жывую асобу для якой характэрна самастойнасць мыслення, рашучасць прапанаваць уласны альтэрнатыўны варыянт грамадскага і асабістага жыццеўладкавання» [2].

Аповесць «Сляды кахання» (1945) апісвае адну з кітайскіх сем'яў перыяду вайны супраціўлення Японіі. Галоўная гераіня Дуньфэн, 36-гадовая прыгожая жанчына, заўдавела ўжо больш за дзесяць гадоў таму. Яна выйшла замуж за 59-гадовага багатага спадара Мі, які хоць і не адрозніваўся знешняй прывабнасцю, але вылучаўся высокім сацыяльным і фінансавым статусам.

Дуньфэн нарадзілася ў адной са старэйшых сем'яў буйных бізнесменаў Шанхая. Хоць у яе і было шмат сваякоў, аднак, пасля смерці першага і горача каханага мужа, у яе не застаецца ні дзяцей, ні грошай, ні падтрымкі сям'і. Гераіня аказваецца кінутая на волю лёсу, у свеце, захопленым мітуснёй ваенных сварак.

Шлюб спадара Мі і Дуньфэн – гэта не плён сапраўднага кахання, а старанна спланаванае і прадуманае дзеянне з двух бакоў. Жонка спадара Мі, якая павольна памірае ад хваробы, больш не радуе яго сваёй маладосцю  і пяшчотай. Дуньфэн жа змучана шматгадовымі тулянням ў пошуку лепшага жыцця. Дзеянне адбываецца ў той час, калі нават заможныя сем'і былі вымушаны эканоміць на ежы, збіраць талоны, каб назапасіць цукар і рыс. Таму абяздоленая Дуньфэн шукае не каханне, а стабільнае і нябеднае жыццё. Пры гэтым для жанчыны было важна атрымаць статус афіцыйнай жонкі з прычыны гарантый, прадугледжаных законам.  Дадзены аспект звязаны і з біяграфіяй Чжан Айлін, якая сама ў пэўны перыяд жыцця знаходзілася ў статусе палюбоўніцы ў мужчыны, які быў старэйшы за яе на 15 гадоў.

Вобраз «новай» жанчыны праяўляецца ў той момант, калі гераіня апынаецца ў вострай сітуацыі выбару. На яе ціснуць грамадскія і асабістыя праблемы: вайна, беднасць, голад, адсутнасць падтрымкі сям'і і адзінота. Адчувальная і ранімая Дуньфэн, якая перажыла мноства пакут, проста вымушана шукаць апору для далейшага жыцця. Важна адзначыць, што сама Чжан Айлін параўноўвае лёс Дуньфэн з дрэвам, якое раптоўна памірае ў час навальніцы, але з цягам часу ўваскрасае.

У грамадстве, апісаным Чжан Айлін, месцы для сапраўдных пачуццяў гераіні не застаецца. Гераіня, вымушаная пагарджаць пачуццямі з мэтай дасягнення стабільнага матэрыяльнага і фінансавага становішча, не страчвае надзею на каханне, якое і становіцца той нязгаснай сілай, што дапамагае Дуньфэн з упэўненасцю рухацца далей, фарміруючы  сваю незалежную жыццёвую пазіцыю.

Такім чынам, гераіня твора «Сляды кахання» Чжан Айлін дапаўняе галерэю жаночых вобразаў, якія адлюстроўваюць «новых» жанчын Кітая. Кожная з іх вымушана пераадолець шэраг жыццёвых выпрабаванняў, каб выйсці на новы ўзровень асобаснай ідэнтыфікацыі. Імкнучыся да самастойнасці і магчымасці ўласнага волевыяўлення, жанчыны ўсё ж  выбіраюць свае спосабы дасягнення жаданага выніку. Так, Бай Люсу, гераіня твора «Каханне,  якое разбурае гарады» (1943), знайшла сваё шчасце побач з каханым мужчынам. Яньлі з аповесці

«Чырвоная ружа, белая ружа» (1944) здолела дасягнуць асобаснай свабоды, толькі пакінуўшы мужа-прыгнятальніка [4]. Дуньфэн жа наадварот, атрымала своеасаблівае выратаванне ў новым шлюбе «па разліку», што стаў пэўным пунктам адліку фарміравання новай незалежнай жыццёвай пазіцыі. Праведзенае даследаванне сведчыць аб тым, што станаўленне вобраза «новай» жанчыны вылучаецца парадаксальным характарам. Нягледзячы на актыўнае імкненне да асобаснага самавыяўлення, жанчыны непазбежна аказваюцца ў залежнасці ад пачуццяў і эмоцый, што прыводзяць іх як да станоўчага зыходу («Чырвоная ружа, белая ружа»), так і да гібелі («Пачуцці, розум») [5].

СПІС ЛІТАРАТУРЫ


1. Купрыянава, Ю. А. Вобраз Новай жанчыны Кітая сярэдзіны XX стагоддзя ў творах Чжан Айлін / Ю. А. Купрыянава // Веснік СПБДУ. –2014. – Сяр. 13. – № 4. – С. 100 –107.
2. Анцыферава, А. Ю. «Новая жанчына»: Мастацкая выдумка і факт. Аблiччы фемінізму на мяжы XIX-XX стст / А. Ю. Анцыферава // Часопіс Жанчына ў расійскім грамадстве. – 2003. – С. 65 –73.
3. Chang Eileen, «Traces of love» / Eileen Chang // graycity.net. – URL: https://graycity.net/eileen-chang/page,1,255107-traces_of_love.html (date of access: 29.01.2025).
4. Chang Eileen, «Red Rose, White Rose» / Eileen Chang // graycity.net. –URL: https://graycity.net/eileen-chang/page,1,413111-red_rose_white_rose.html ( date of access: 29.01.2025).
5. Чжан Айлін, «Пачуцці, розум» / Айлін Чжан // Пераклад : А. Цярэшчанка – Сучасная літаратура Кітая. – URL: https://sanwen.ru/2012/05/01/chzhan-ajjlin-chuvstva-razum-pervaya-chast/ (дата звароту: 29.01.2025).